ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 91 (1058) | СУБОТА, 19-га красавіка 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

ГОД ВЫДАНЬНЯ IX.

Кошт асобнага №—2 кап.

На плячох „рабочага" ўраду цьвёрдалобыя колы ангельскай буржуазіі адкрыта працуюць у цясьнейшым кантакце з белагвардзейскімі бандытамі.

Лёндан ператварыўся, мабыць, з маўклівай згоды ўраду, у арганізацыйны цэнтр падрыхтоўкі паходу супроць СССР.

(З газэт).



Усе шляхі вядуць у... Лёндан.

Працэс украінскай контррэволюцыі

Уся дзейнасьць „СВУ" была накіравана на нізрынуцьце савецкага ладу

Прамова прокурора тав. Ахматава

ХАРКАЎ, 15. (ТАСС). Тав. Ахмаў падрабязна абрысоўвае контррэволюцыйную работу „СВУ" на ультурным фронце.

Ставячы сваёй задачай захват свае рукі галоўнейшых вучастаў гэтага фронту,—гаворыць тав. хматаў, — „СВУ" раней за ўсё вярнуў увагу на мастацкую літаратуру. Неабходна з задавальнем констатаваць, што малая савецкая літаратура Украіны лкам не падпала пад уплыў онтррэволюцыйных ідэй „СВУ".

Таксама няўдалымі аказаліся робы „СВУ" прыбраць к сваім укам асобныя літаратурныя групкі.

Характарызуючы дзейнасьць „СВУ" у Акадэміі Навук, пракурор водзіць, што падсудныя прынялі се меры к таму, каб ператварыць УАН—гэты цэнтр навуковай думУкраіны—у базу для дзейнасьці кадэмічнай групы „СВУ".

Спыняючыся на рабоце мэдынскай сэкцыі ВУАН, тав. Ахмаў прыходзіць да выніку, што эдыцынская група „СВУ" уяўляе бою зборышча ярых, лютых ворагаў савецкай улады, зборышча одзей яўна контррэволюцыйных.

Прамовы абвінаваўцаў Быстракова і Якімішына

ХАРКАЎ, 16. (ТАСС). Пракурор в. Быстракоў абвінавачвае членаў пэрыфэрыі „СВУ".

Організаваныя па дырэктыве нтру ў шэрагу гарадоў Украіны ліі „СВУ" здолелі аб'яднаць вал сябе ўсе рэшткі пятлюраўшчы. Аддзяленьні „СВУ" праводзілі лікую шкодніцкую работу, але не ўдалося ашукаць і ўцягнуць авантуру працоўных.

Тав. Быстракоў дае характарыыку асобных падсудных і патрае ад суда пазбаўленьня іх свады на розныя тэрміны. Для ізьнюка пракурор патрабуе ізоцыі на доўгі тэрмін.

Для члена нікалаеўскай філі „СВУ" Лагуты, прымаючы пад увагу яго раскаяньне, пракурор патрабуе ізоляцыі ад савецкай грамады на той тэрмін, які суд прызнае неабходным. Таго-ж самага пракурор патрабуе для падсуднага Карповіча, члена чарнігаўскай філіі „СВУ", праводзіўшага контррэволюцыйную работу ў навуковым таварыстве Чарнігава.

Падсудны Яфрэмаў П., організатар і кіраўнік днепрапятроўскай філіі „СВУ", праводзіў контррэволюцыйную нацыяналістычную работу, падрыхтоўваў контррэволюцыйныя кадры для нізрынуцьця савецкай улады. Тав. Быстракоў патрабуе для яго ізоляцыі ад савецкай грамады на доўгі тэрмін.

Для членаў днепрапятроўскай філіі „СВУ" Бядновай і Белага прокурор патрабуе ізоляцыі ад савецкай грамады.

Падсудны Панчанка-Чапенка належаў да адэскай філіі „СВУ". Падсудны Слаўчанка Тарас, малады фашысты, член адэскай філіі „СВУ", праводзіў на культурна-асьветным фронце нацыяналістычныя антысавецкія ідэі, групуючы вакол сябе контррэволюцыйныя элемэнты, каб выхаваць з іх кадры на выпадак паўстаньня і інтэрвэнцыі. Ён таксама павінен быць ізаляваны ад савецкай грамады.

Падсудны Слабчанка Міхась — організатар і кіраўнік адэскай філіі „СВУ". Ён праводзіў антысавецкую шкодніцкую работу ў ВНУ. Слабчанка марыў аб фашысцкай ваеннай дыктатуры. Выконваючы ўскладзеныя на яго „СВУ" абавязкі, ён падрыхтоўваў адпаведныя контррэволюцыйныя кадры.

Апошнім гаварыў прокурор Якімішын. Дзяржаўны абвінаваўца асьвятліў ролю асобных груп падсудных і падрабязна спыніўся на акадэмічнай групе „СВУ" да якой належаў падсудны Галаскевіч.

Галаскевіч—сын папа, член цэнтральнай рады і сэкратар БУД'у. Галаскевіч прымаў у сябе ў габінэце ў акадэміі навук польскіх шпіёнаў і організаваў дапамогу сем'ям эмігрантаў-будаўцаў, скарыстаўшы для гэтага офіцыйнае прадстаўніцтва аднэй суседняй дзяржавы. Калі БУД разваліўся, Галаскевіч прымаў удзел у організацыі „СВУ", а потым кіраваў ячэйкай, організаванай „СВУ" у камісіі слоўніка жывога слова. Праз гэтую ячэйку ён праводзіў ідэі „СВУ" сярод супрацоўнікаў акадэміі, а таксама і па-за ёю. Прымаючы пад увагу ўпартую і сыстэматычную контр-рэволюцыйную работу, якую падсудны праводзіў сьвядома ў працягу 10 год, прокурор патрабуе для Галаскевіча строгай і доўгай ізоляцыі ад грамады.

Другой акадэмічнай ячэйкай „СВУ" была ячэйка пры Інстытуце украінскай навуковай мовы, якою кіраваў падсудны Халодны. Згрупаваўшы вакол сябе нацыяналістычнае і варожае савецкай уладзе настаўніцтва, Халодны ператварыў школу ім. Коцюбінскага ў цытадэль для пятлюраўскага выхаваньня дзяцей. Сваім „выхаваньнем" Халодны калечыў сотні дзяцей, прынёс агромністую шкоду пролетарскай культуры і за гэта павінен адказаць перад Вярхоўным Судом і ўсімі працоўнымі. Выгнаны з чарнігаўскай школы, Халодны пападае ў Інстытут навуковай мовы, дзе організуе контррэволюцыйную ячэйку пад назвою „Інарак". „Інарак" пропагандаваў ідэі „СВУ", маючы мэтаю падрыхтоўку паўстаньня і інтэрвэнцыі.

Прокурор лічыць даведзеным, што „Інарак" сапраўды быў контррэволюцыйнай организацыяй „СВУ" і меў задачай нізрынуць савецкую ўладу.

Гэтую работу выконвалі ўсе „інаракаўцы" - падсудныя: Дуброўскі, Крывенюк, Туркало, Шарко і Страшкевіч. Для іх пракурор патрабуе таксама ізоляцыі.

Затым прокурор пераходзіць да коопэратыўнай групы „СВУ". Ён лічыць даведзеным абвінавачваньне членаў гэтай групы Балазевіча і Батыноўскага ў контррэволюцыйнай дзейнасьці і патрабуе для іх ізоляцыі. Прокурор патрабуе таксама строгай ізоляцыі і для Мікалая Чахоўскага.

Сьцяг рэволюцыі палыхае над Кітаем

Большасьць раёнаў у Паўднёвай частцы Гуандуню заняты комуністычнымі войскамі

Атрады Чу-дэ трымаюць у сваіх руках значную тэрыторыю у Чжансі і Фуцьзяне

ШАНХАЙ, 17. Як паведамляюць ангельскія газэты, выходзячыя ў Гонконзе, большасьць раёнаў у паўднёвай частцы Гуандуню занята комуністычнымі войскамі. Як паведамляе „Бай-Бао" на поўнач ад Сватоу комуністыя ўстанавілі цесную сувязь з комуністычнымі войскамі, якія дзейнічаюць у провінцыі Фуцзян. Комуністымі пераразьмеркаваны рысавыя палі, конфіскаваны і спалены купчыя крэпасьці на зямлю.

«Гонконг Тэлеграф» (ангельская газэта, якая выходзіць у Гонконзе) піша: „дзейнасьць комуністых у раёне Сватоу набывае ўсё большыя і большыя памеры. Комуністычныя салдаты не чапаюць беднаты. Яны плоцяць за іх, заяўляючы паўсюды, што беднякам нечага баяцца. Існуе рэальная небясьпека, што ў чырвоную фарбу будзе афарбавана тэрыторыя больш аграмадная, чым калі-небудзь раней. Чу-Дэ, Мао-Чэ-Дунь ужо трымае ў сваіх руках значную тэрыторыю ў чжансі і Фуцзяне. Калі толькі ўрад ня прымае сур'ёзных мер,—яны падпарадкуюць сабе Сватоу і ўвесь прымежны раён.

Савецка-ангельская гандлёвая згода

Водгукі буржуазнай прэсы ў Ангельшчыне,

Лёндан, 17. „Дэйлі Гэральд", комэнтыруючы англа-савецкую гандлёвую згоду, піша: «Становішча, утворанае налётам на Аркос, было катастрафічным для ангельскага гандлю і небясьпечным для ўсеагульнага міру. Рабочы ўрад прыпыніў нарастаньне гэтай небясьпекі. Часовая гандлёвая згода ўяўляе сабой першы этап да ўрэгуляваньня ўсіх яшчэ нявырашаных рознагалосьсяў між ангельскім і савецкім урадамі, у тым ліку да ўрэгуляваньня фінансавых прэтэнзій і контр-прэтэнзій, узьнікшых у выніку рэволюцыі".

Консэрватыўная „Морнінг пост" выказвае сваё нездавальненьне з прычыны заключэньня гандлёвай згоды. Іншыя газэты публікуюць без комэнтарый альбо поўны, альбо кароткі зьмест дагавору і заявы тав. Сакольнікава.

За парушэньне законаў саляной манаполіі

ЛЁНДАН, 17. Суд у Сураку прыгаварыў да 12 месяцаў турэмнага зьняволеньня старшыню і скарбніка сурацкага камітэту **усеіндыйскага** *нацыянальнага конгрэсу* **Нета** *і* **Марфачыа** *за заклік да парушэньня законаў саляной манаполіі.*

Памёр французскі рэволюцыянэр Пэдрон

ПАРЫЖ, 17. Ва ўзросьце 81 г памер французскі рэволюцыянэр Пэдрон. У 1779 годзе Пэдрон уступіў у французскую рабочую партыю. Пасьля зьезду социялістычнай партыі ў Шуры, на якім адбыўся раскол, Пэдрон далучыўся да рэволюцыйнай часьці зьезду, ня гледзячы на сваю старасьць, актыўна працаваў у комуністычных організацыях.


Аўтабудаўніцтва ў СССР

МАСКВА, 18. Прадстаўнік ВАТО в. Колежаеў выступіў на ўсесаай аўтадарожнай конфэрэнцыі з льмі цікавым дакладам аб проаме аўта-будаўніцтва і выпуску шын на бліжэйшыя гады.

Па распрацаванай ВАТО пяцігод- выпуску аўтамашын на нашых водах, да канца пяцігодкі мяркуца выпусьціць 365 тысяч аўтаашын, з іх каля 280 тысяч груых і каля 86 тысяч лёгкавых, ырохмесных. Па пляну ВАТО ў учым годзе мяркуецца выпусьціць 9910 грузавых машын і 2058 легкавых, у 1930-31 годзе—34 тысячы грузавых і 10 тысяч легкавых, у 1931-32—97 тысяч грузавых і 12 лёгкавых і ў апошні год пяцігодкі ў 1932-33 годзе—140 тысяч грузавых і 50 тысяч легкавых.

Разьвіцьцё аўта-вытворчасьці патрабуе за пяцігодку больш 180 мільёнаў рублёў капіталаўкладаў. З іх 84 млн. рублёў будзе выдаткавана ў бягучым годзе і каля 90 млн. руб. у 1930-33 годзе.

Наша краіна індустрыялізуецца



Варштатабудаўнічы завод імя Сьвярдлова ў Ленінградзе выпусьчарговую (3-ю) партыю магутных дзеўбальных варштатаў, якімі талёўваюцца нашыя новыя мэталёвыя заводы. Паступова Савецкоз вызваляецца ад замежнай залежнасьці.

На здымку:—Чарговая партыя новых такарных варштатаў

Праявы новай варожасьці да СССР у Нямеччыне

БЭРЛІН, 17. Друк працягвае абгаварэньне пэрспэктыў нямецка-савецкіх зносін. „Бэрлінер Бэрзэн Кур'ер" у артыкуле пад загалоўкам „Рапалло, ці крыжовы паход", паўтарае аб выніках зацьвярджэньня, што Нямеччына расчараваная ў сваіх зносінах з Савецкім Саюзам, як у політычнай, так і ў гаспадарчай галінах. У доказ таго нездавальненьня Мюльлер спасылаецца на апошнюю рэзолюцыю рускага камітэту нямяцкіх дзелавых колаў. Газэта далей піша, што ў шмат якіх колах цяпер пануе такі настрой супроць бальшавіцкай Расіі, які назіраўся з 1919 па 1921 год. Праяву гэтай новай варожасьці можна канстатаваць у Нямеччыне, асабліва ў правых колах партыі цэнтру і ў колах соц. дэмократаў, якія заўсёды неахвотна ішлі на замежную політычную сувязь з Савецкім Саюзам.

— Прышоў час— заключае газэта,—калі трэба сур'ёзна гаварыць аб пэўным абгаварэньні рапальскага і бэрлінскага дагавораў, хаця гэта не азначае, што нямецкая замежная політыка павінна далучыцца да крыжовага паходу супроць Савецкага Саюзу.

„Бэрлінэр Тагеблят" у сваім артыкуле застанаўліваецца галоўным чынам на ўнутрыполітычным становішчы Савецкага Саюзу і констатуе, што бяздоньне, якое разьверглася ў апошнія гады паміж Савецкай дзяржавай і астатнім сьветам, усё больш паглыбляецца. Аднак, захаваньне рапальскага дагавору зьяўляецца, па думцы газэты, неабходным.

Профбюрократы сарвалі забастоўку докераў

Лёндан, 17. Трэд'юніёнісцкім профбюрократам удалося шляхам запалохваньня рабочых сарваць забастоўку докераў у Бэльфордзе, ахапіўшую 2 **тысячы** рабочых. Забастоўка была абвешчана без дазволу рэформісцкага профсаюзу.

Шарсьцянікі ўпарта працягваюць барацьбу. Профсаюзныя бюрократы імкнуцца падарваць баявы дух бастуючых 150.000...

ЛЁНДАН, 17-4. Выканком асоцыяцыі профсаюзаў тэкстыльнай прамысловасьці паведамляе, што 50000 шарсьцянікаў працуе на старых умовах, атрымліваючы ранейшыя стаўкі, 7000 працуюць, атрымліваючы паніжаныя стаўкі, а 75000 —бастуюць. ГЭТЫЯ ЛІЧБЫ ГРУБА СКАЖАЮЦЬ САПРАЎДНАСЬЦЬ. Цыфра колькасьці бастуючых таксама ня верная. Нават у буржуазных колах не выключаюць магчымасьці ліку бастуючых у 150000. ПРОФСАЮЗНАЯ БЮРОКРАТЫЯ, ПРЫСЯГАЮЧЫ ДА ГРУБОГА СКАЖЭНЬНЯ САПРАЎДНАСЬЦІ, ПРАСЬЛЕДУЕ ЯЎНУЮ МЭТУ ПАДАРВАЦЬ БАЯВЫ ДУХ БАСТУЮЧЫХ. Аднак, дагэтуль толькі ў адным адзеглым раёне зарэгістраваны выпадак звароту рабочых на работу.

Да гадавіны соцспаборніцтва

ЛЕПШЫ ПАДАРУНАК ДА ГАДАВІНЫ СОЦСПАБОРНІЦТВА

— перавыкананьне прамфінпляну;

— сотні новых ударнікаў;

— дзесятні ўдарных цэхаў і фабрык

Да гадавіны засталося мала часу. Узмацнім падрыхтоўку да гадавіны соцспаборніцтва

„КАСТРЫЧНІК" РЫХТУЕЦЦА

Комсамольскі колектыў ф-кі „Кастрычнік" падрыхтоўку да гадавіны соцспаборніцтва вядзе даўно. Складзен належны плян. Ячэйка мяркуе зрабіць пераклічку комсамольцаў па пытаньню ажыцьцяўленьня лёзунгу—„тварам да вытворчасьці". У хуткім часе будзе організаваны музэй браку і пераробак. Да гадавіны працуюць брыгады па праверцы выкананьня дагавораў па соцспаборніцтву і выкананьня прамфінпляну. Рыхтуецца выезд у падшэфную вёску, дзе будуць прапрацаваны лічбы і дасягненьні ў выкананьні прамфінпляну.

Актыўны ўдзел у падрыхтоўчай працы прынялі піонэры, якія сапраўды зьявіліся ініцыятарамі зьнішчэньня прагулаў. Пры незьяўленьні на працу рабочых яны ідуць зараз-жа да іх на дом і ў значнай меры ўзьдзейнічаюць на прагульшчыкаў.

Для ўнясеньня прапаноў па зьнішчэньню недахопаў створана рацыяналізатарская група, якая трымае цесную сувязь з інжынэрна-тэхнічнымі сіламі фабрыкі. Усяго ўнесена каля 30 рацыяналізатарскай прапаноў. За добрую працу былі прэміяваны лепшыя комсамольцы. Па ініцыятыве комсамолу вылучана камісія з рацыяналізатарскай групы на фабрыку „Адраджэньне" з мэтай выяўленьня чаму апошняя дае гузікі дрэннай якасьці.

Таксама організуецца бытавая комуна, якая ахопіць 30-40 чалавек.

Усё гэта дасягнута дзякуючы ўпартай працы комсамольскага колектыву, дзякуючы стараньням асобных комсамольцаў. Праца на „Кастрычніку" павінна зьявіцца прыкладам для ўсіх іншых прадпрыемстваў. Але і ф-цы „Кастрычнік" на гэтых посьпехах нельга спыняцца, трэба яшчэ больш энэргічна ўзяцца за далейшую працу.

Дасягнутыя посьпехі павінны быць замацованы для далейшага пасьпяховага наступу.

ВІХОР З.

Разгарнуць работу, пакуль ня позна

Да правядзеньня гадавіны соцспаборніцтва ў Рудзіцкім сельсавеце ніхто ня рыхтуецца. Ні чыгуначнікі, ні партыйныя, комсамольскія ячэйкі гэтага пытаньня яшчэ не абгаварвалі.

Соцспаборніцтва яшчэ ня стала мэтадам наладжваньня працы ў колгасах.

Пакуль яшчэ ня позна, неабходна разгарнуць працу, бо час не чакае.

Г. Фрыд,

Добрыя пачынаньні сустракаюць перашкоды

Завод „Рухавік Рэволюцыі" абвесьціў сябе ўдарным, ён занесены на чырвоную дошку, як першы па выкананьню прамфінпляну.

Комсамольская ячэйка адыграла вялікую ролю ў выкананьні прамфінпляну. Некаторыя добрыя пачынаньні моладзі сустракаюць перашкоды. Вось, напрыклад,—організацыі маладзёжных комун. З боку заводзкіх організацый няма ніякага садзейнічаньня. Маладзёжная комуна працуе ўжо звыш трох месяцаў і на яе работу ніхто не зьвяртае ўвагі. Старэйшы майстар Глайхман называе маладых рабочых рвачамі. Комсамольская-ж ячэйка таксама стаіць у баку ад гэтых фактаў. Маюцца на заводзе ілжэ-ударнікі. Комсамолец Андрэеў разводзіць плёткі, падрывае інтэнсыўнасьць працы.

Г. Курцэр.

Чакаюць... чаго?

Плешчаніцкая організацыя комсамолу нічога ня робіць па падрыхтоўцы да гадавіны соцспаборніцтва. Райком комсамолу гэтае пытаньне не абгаварваў. Умовы па соцспаборніцтву заключаны, але праверкі дагэтуль яшчэ ня было, яны выконваюцца вельмі дрэнна. Комсамольцы абвяшчаюць сябе ўдарнікамі, а на справе гэтага званьня не апраўдваюць. Таксама партыйныя і савецкія організацыі не вядуць ніякай падрыхтоўкі да гадавіны соцспаборніцтва.

Чачотка.

БАРЫСАЎЦЫ КАЧАЮЦЬ...

Бабруйская гарадзкая комсамольская організацыя пачала сваечасова падрыхтоўку да правядзеньня гадавіны соцспаборніцтва. Гарком распрацаваў належныя мерапрыемствы, конкрэтны плян па ўсіх гарадзкіх ячэйках. Была склікана нарада сэкратароў ячэек, АПА-працаўнікоў, „Лёгкіх Кавалерыстых", дзе была праведзена растлумачальная праца па гэтаму пытаньню.

Як быццам усё добра, але практычна праца яшчэ не разгорнута так, каб уся комсамольская маса была сапраўды ініцыятарам і кіраўніком у гэтай справе. Яшчэ да гэтага часу большасьць комсамольскіх ячэек не прыступіла да падрыхтоўкі. У некаторых момантах профэсыйныя камітэты тармозяць правядзеньне гэтай вялікай політычнай кампаніі. Комсамольскі колектыў комбінату, які зьяўляецца самай буйнай адзінкай гарадзкой організацыі, да гэтага часу яшчэ нічога не зрабіў. Яшчэ нават ня склікалася бюро ячэйкі, дзе магчыма было-б распрацаваць належныя мерапрыемствы. Становішча колектыву КСМ вельмі дрэннае. Сэкратар за непрацаздольнасьць зьнят з працы, а новага няма, і зараз колектыў знаходзіцца без усялякага кіраўніцтва.

Неабходна зараз-жа Гаркому і Акругкому комсамолу накіраваць колектыў комбінату на верны шлях, даць належнае кіраўніцтва і дапамогу. Адбыўшаяся нарада сэкратароў комсамольскіх ячэек па пытаньню ходу падрыхтоўкі да гадавіны соцспаборніцтва, на якой былі пастаўлены інформацыі з месц, адзначыла, што комсамольская організацыя нездавальняюча ўдзельнічае ў падрыхтоўчай працы і недастаткова мобілізавала ўвагу комсамольцаў і рабочай моладзі вакол гэтага пытаньня.

„Лёгкая Кавалерыя" у такі сур'ёзны політычны момант здала сваю зброю і зусім адышла ад барацьбы.



Быццам-бы вады ў рот набралі...

У друку не вядзецца належнай працы па асьвятленьню ходу падрыхтоўкі і абмену вопытам. У зьвязку з гэтым зусім зразумела, што рост організацыі вельмі слабы. Такое становішча далей цягнуцца ня можа.

Сымон Музыка.

Аб Фрунзэўскім „Ударніку"

26-га красавіка склікаецца конфэрэнцыя рабочай моладзі Фрунзэўскай раённай організацыі. Гэтая конфэрэнцыя, прысьвечаная гадавіне соцыялістычнага спаборніцтва, павінна будзе падвесьці вынікі працы моладзі на вытворчасьці і яе барацьбы за бальшавіцкія тэмпы работы, яе барацьбы за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну. Па цэлым шэрагу буйных прадпрыемстваў Фрунзэўскага раёну прамфінплян за другі квартал быў недавыканан. Комсамольскі колектыў заводу „Комунар" за ўдалую працу на вытворчасьці атрымаў пераходны Чырвоны сьцяг. У другім квартале гэтага году прамфінплян быў выканан ня поўнасьцю. Паўстала пытаньне аб перадачы сьцягу больш перадавым колектывам.

Вось чаму зараз перад гадавінай соцспаборніцтва пытаньне ўдзелу моладзі ў вытворчым жыцьці набывае значэньне асаблівай важнасьці. Гэтаму ўдзелу павінна будзе падвесьці вынікі раённая конфэрэнцыя, перад якой Фрунзэўскі РК комсамолу выпускае аднадзённы друкаваны нумар газэты „Ударнік", якая павінна будзе асьвятліць усю працу організацыі, паказаць добры вопыт працы ўдарных брыгад, цэхаў, паказаць твар ілжэўдарнікаў, вопыт працы вытворча-бытавых комун, ход будаўнічага сэзону і цэлы шэраг іншых вытворчых пытаньняў.

Выпуск гэтай газэты будзе лепшым сродкам абмену вопытам і падрыхтоўкі да конфэрэрцыі. Зараз-жа нам неабходна організаваць юнкораўскія сілы для асьвятленьня вопыту працы, адлюстроўваньня становішча нашай працы на вытворчасьці.

Кажны малады рабочы-комсамолец павінен быць юнкорам «Ударніка» і тады пастаўленыя перад газэтай задачы будуць выкананы.

Л. Гл.

Сёньня, а 6-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні в-ва „Чырвоная Зьмена" (Комсамольская, 25) адбудзецца нарада інструктарскай групы „Ч. З.". Яўка абавязкова

Выдавецтва „Ч. З.".

ВАРОЎСКАГА, 5

(Ад нашага спэцыяльнага корэспондэнта)

Масква. Лубянскі праезд. Ля кітайскай сьцяны раскладалі свае кніжныя багацьці дзесяткі букіністых.

У гэты дзень, 14 красавіка, мы ўчатырох купляем тут кнігі. Букіністы, убачыўшы, што мы разглядаем кнігу Маякоўскага: „Маякоўскі сьмяецца, Маякоўскі зьдзекваецца", сказаў:

— Маякоўскі вось тут насупроць жыў,—Лубянка № 3. Сёньня хуткая дапамога прыяжджала... Ён застраліўся... Мы зарагаталі:—Бачце, які! Вутку пушчае,—думае, каб мы гэта хутчэй за кнігі ўхапіліся. Вашы хітрыкі нам зразумелы!



Маці Маякоўскага ля яго дамавіны

Жыцьцё і творчасьць поэты-рэволюцыянэра Маякоўскага ніяк не маглі ўжыцца з думкаю, што ён застраліўся. Але назаўтра, разгарнуўшы газэту, мы пераканаліся, што букіністы быў праў.

У гэтую раніцу Масква зьвінела галасамі газэтчыкаў:

— Рабочая Масква! Рабочая Масква! Самагубства поэты Ўладзімера Маякоўскага!

Ля газэтчыкаў спыняліся людзі, рыўком хапалі газэты і тут-жа згрудзіўшыся ў групкі чыталі гэтую нечаканую і ашаламляючую вестку...

* * *

Вуліца Вароўскага № 52. Белы двухпавярховы флігель у двары.—Клюб фэдэрацыі аб'яднаных савецкіх пісьменьнікаў. 10 гадзін раніцы. Вялікі двор густа набіты людзьмі. Тут рабочыя, студэнты, служачыя, вучні. Усё больш і больш вырастае шматтысячная людзкая калёна; яна выгінаецца па вуліцы Вароўскага, выпаўзае на Кудрынскую плошчу.

Унутры белага флігелю, у конфэрэнц-залі—убіраюць Маякоўскага. У суседніх пакоях родзічы і бліжэйшыя сябры нябожчыка.

Ніяк ня верыцца, што Маякоўскі памёр.

Ён ляжыць у труне спакойна, з зашчэмленымі вуснамі і чорным адлівам пад вачыма. Тут-жа, унутры гэтага белага флігелю сваёй творчасьцю і жыцьцём кіпіць рэволюцыянэр-поэта Маякоўскі. Чуецца, гэта ён кліча,

Пусть их скулит дядье:
Нашы ряды юны.
Мы
Наверно войдем
В самый полдень комму

Гэта ён, барацьбіт супро
насьці і мяшчанства, грымі
басам.

Явившись
В Це-Ка-Ка
Идущих светлых лет,
Над бандой
поэтических
рвачей и выжиг,
Я подыму,
Как большевистский пар
Все сто томов
Моих
партийных
книжек.

* * *

Мядзяныя галасы аркестр
ваюць жалобны марш.
жэктары скрыжавалі стр
сьвятла над ім.

Нібы баючыся разарваць
лы спакой на яго твары,
чы па падлозе рушаць
Углядаюцца ў яго і выход

Застыгла стаіць варта—пі
нікі, поэты, грамадзкія дзе

Расьце і набухае на вуліц
кая калёна.

Сягоньня апошні дзень. П
ныя вуліцы ўвабралі ў сябе
кі тысяч людзей. З гадзін
Распачынаецца грамадзкая п
Гаворраць: Луначарскі, Халата
стаўнікі ЦК УсеЛКСМ, Фос
савету.

4 гадзіны 45 хвілін.
хваля коціцца, нясучы на
грэбні цела Маякоўскага.

За дамавінай—дзесяткі т

Поэта - рэволюцыянэр Ма
не памёр. Ён жыве ў марш
ных брыгад, у „ста томах
партийных книжек". Гэта

Делами,
Кровью,
Строкою вот этою,
Нигде
Не бывшею
в найме,—
Я славлю
Взвитое красной
Ракетой
Октябрьское,
Руганное
И пропетое,
Пробитое пулями
Знамя

Алесь Ліп

Москва, 17 красавіка, 1930

Да ўвагі ўсіх членаў ЛКСМБ і рабочай мола

У маі месяцы „Комсомольская Правда" спраўляе свой 5-га
юбілей.

А 15-га чэрвеня адчыняецца 16-ты ўсесаюзны партыйны зье
Мэтады сьвяткаваньня комсамольскімі організацыямі юб
сваёй газэты ўжо зараз атрымліваюць шырокае асьвятлень
старонках „Комсомольской Правды". Таксама на старонках „К
мольскай Правды" пачынае разгортвацца прадзьездаўская кам
матар'ялы зьезду будуць штодзённа зьмяшчацца ў газэце.

Попыт на „Ком. Правду" штодзённа пачынае ўзрастаць, у
з чым, выдавецтву неабходна загадзя загатовіць адпаведную
касьць паперы для таго, каб поўнасьцю і сваечасова ўсіх задав
газэтай

Беларускае аддзяльньне выдавецтва ЦК УсеКП(б) „Правда",
ваючы гэтыя вельмі важныя абставіны і жадаючы здаволіць га
„Ком. Правда" усіх комсамольцаў і беспартыйную моладзь, пр
паклапаціцца аб сваечасовай выпісцы „Ком. Правды" з мая мес
больш доўгі тэрмін.

Беларускае Аддзяленьне Выда-
вецтва ЦК УсеКП(б) „Правда"

Менск, Савецкая. 61
Тэл. №№ 8-21 і 7-03.

Чыстка КСМ выпускнікоў ВНУ і тэхнікумаў

Па актыўнасьці, масавасьці, разгорнутай самакрытыцы

ПАТРЭБНА СУДЗІЦЬ АБ ВЫНІКАХ ХОДУ ЧЫСТКІ КОМСАМОЛЬЦАЎ ВЫПУСКНІКОЎ ВНУ

У Віцебскім політэхнікуме была змазана політычная сутнасьць чысткі,—поўная адсутнасьць удзелу рабочай моладзі. Чыстка не праводзілася на грунце разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі

мазалі політычныя задачы чысткі

мсамольскі колектыў Віцебскаолітэхнікуму знаходзіцца нададні поўнага развалу. Чыстка амольцаў апошніх курсаў прана. Яна зьявілася лепшым лю м стану працы колектыву. вааздача бюро колектыву бысім няжыцьцёвай. Дакладчык рыў аб тым, чаго колектыў зуе рабіў. Спрэчкі не разгарну- На сходзе і наогул на пасед нях праверачнай камісіі прычалі па 20-25 чалавек з 130 энтаў. Наглядаліся выпадкі, ка амі комсамольцы апошняга у не зьяўляліся. З прымацаіх рабочых ячэек ня было ніага чалавека.

з удзелу і ведама мас

мая чыстка праходзіла бяз уся актыўнасьці і крытыкі. З бо тудэнтаў 4-га курсу была „змо аўчаньня", а калі хто-небудзь зваўся, дык абавязкова адзна добрыя бакі, тады як на 4-м е быў вялікі прарыў у рабоце ы шэраг комсамольцаў быў ты з грамадзкай работы, атрыспагнаньні, а частка была вы ана з комсамолу (за п'янку, эжэньне і г. д.).

ікага папярэдняга абсьледня работы колектыву ня бы- Вылучаная рабочая брыгада ярнай фабрыкі) нічога не ла, не пацікавілася станові работы тэхнікуму. Ніякай ра ачальнай работы, як сярод энцтва, так і настаўніцтва, ня праведзена. Трэці курс, які за ўсіх ведае выпускнікоў амольцаў, знаходзіўся тады актыцы. Ніякай політычнай чыстка не дасягнула, ня гле на якія-б там ні было вынікацы камісіі.

і мы зацікавімся работай коыву, дык заўважым цэлы шэолітычных прарываў у яго це. Група комсамольцаў пер курсу сыстэматычна зьдзек я над яўрэем Геніным; яго біалі на падлогу, ня пускалі ў нат, склалі спэцыяльную ан іцкую песьню. І калі ён па аяву на бюро комсамольскай і, дык яна дала гэтым „антым вымову, а яму... суровую ву, мотывуючы, што імі было лена хуліганства, а Геніным нізм. (За яго выкрык: „палякі— і", які ў сапраўднасьці меў). Бюро не разабралася ў сьці гэтае справы, не пацікася склаўшыміся абставінамі ышло да вырашэньня гэтага ньня прымірэнцкі. Яшчэ больш на" вырашыў пытаньне агульход ячэйкі,—ён даў усім вы. І толькі пасьля зьяўленьня эце „Віцебскі Пролетары" ару аб фактах антысэмітызму міранцтва да яго, была выа партыйная камісія. Толькі я ўмяшаньня парт'ячэйкі, му і газэты, антысэміты быключаны з комсамолу. Генін вой шовіністычны выпадак маў спагнаньне. Але досыць паглядзець на сход комсакага колектыву, які быў яльна скліканы па гэтаму ьню.

Як вырашаюць справу антысэмітызму

У многіх комсамольцаў і нават комуністых была думка, што справу раздулі, што тут нічога няма. Гэта былі ня толькі думкі, але і словы, і пад націскам прайшла прапанова парт'ячэйкі. А пры галасаваньні аказалася, што на сходзе ня было і паловы комсамольцаў колектыву,—яны пашлі сьнедаць.

Калі мы глянем, як праходзіць соцспаборніцтва ў тэхнікуме, дык адразу кінецца ў вочы, што тут нічога ня робіцца. Тыя маленькія дасягненьні, якія маюцца ў рабоце, не належаць да „посьпехаў" колектыву. Ніякай работы па акадэмпасьпяховасьці, па перабудове вучэбнай програмы, па ўдзелу ў правядзеньні бесьперапыннай вытворчай практыкі, комсамольскім колектывам і ячэйкамі паасобна не праводзілася.

Як колектыў у цэлым, так і бюро ня маюць свайго твару ні ў тэхнікуме, ні па-за ім. Комсамольскі колектыў трымае „сувязь" з колектывам „Чырвонага Мэталістага", але гэта сувязь трымаецца толькі на паперы.

Па трохмесячніку беларускай пролетарскай культуры таксама нічога ня зроблена. Вынесена шмат рэзолюцый, але яны не праведзены ў жыцьцё. Беларуская мова не ўвайшла ў быт тэхнікуму.

Пасеўная кампанія таксама прашла міма комсамольскага колектыву; гэтае пытаньне ніколі не абгаварвалася на комсамольскім сходзе. Цяпер, калі глянуць на дысцыпліну сярод комсамольцаў, дык трэба сказаць, што яна вельмі дрэнна пастаўлена. Комсамольцы ня плоцяць па 4-5 і нават 8 месяцаў членскіх узносаў. Бюро колектыву за непрацаздольнасьць зслабаніла ад работы сэкратара мэханічнай ячэйкі, — таго самага, які на сходзе колектыву даводзіў, што ніякага антысэмітызму няма, што парткамісія прыняла жандармскія мэтады расьсьледваньня фактаў. І вось—яго толькі зьнялі з працы.

Неабходна праверыць стан колектыву

У колектыве поўны правал масавай політычна-выхаваўчай працы, кіраўніцтва некаторымі грамадзкімі організацыямі (МОПР, ТСА-Авіяхэм і г. д.) зышло на смарку. Маецца выпадак замаху на самагубства комсамольца,—спэцыяльна на глебе грамадзкай работы, адсутнасьці ўдзелу ў гаспадарчым жыцьці тэхнікуму і г. д.

На прарывы ў рабоце колектыву паказвала партыйная ячэйка, насьценгазэта. Але гэтыя сыгналы ня былі падхоплены.

Райкому комсамолу трэба зараз-жа праверыць работу ўсяго колектыву, трэба зьняць з кіраўніцтва тых, якія давялі да такога стану колектыў. Камісія па чыстцы павінна вельмі пільна падысьці да праверкі кожнага выпускаемага комсамольца паасобку.

ВЫПУСКНІК.



На здымку: Зьверху: праверачная камісія па чыстцы выпускнікоў- каўцаў. Унізе—рабфакаўцы на сходзе па чыстцы.

З САМАКРЫТЫКАЙ НЯ НАДТА ДОБРА...

Гутарка з старшынёю камісіі па чыстцы КСМ Менскага рабфаку—тав. Гузікавым

Чыстка комсамольцаў апошняга курсу Менскага рабфаку ўскалыхнула ўсю масу студэнцтва.

Насьценгазэта сваечасова ўзьняла гэтае пытаньне і мобілізавала навакол яго грамадзкую думку ня толькі сярод студэнцтва, але і рабочых-падшэфнікаў менскіх вагонных майстэрняў.

Чыстка ўжо праходзіць два дні, прысутнічае на ёй каля 200 чалавек. На абодвух пасяджэньнях прысутнічалі рабочыя брыгады з вагонных майстэрняў. Трэба адзначыць, што настаўніцкі склад амаль поўнасьцю адсутнічае. Вядома, што віна ў гэтым часткова кладзецца на бюро комсамольскага колектыву, якое не праводзіла адпаведнай падрыхтоўкі сярод настаўніцтва.

Рабфакаўцы ў асаблівасьці павінны былі трымаць самую шчыльную сувязь з вытворчасьцю, павінны былі зьяўляцца першымі памочнікамі і ў выкананьні і ў перавыкананьні прамфінпляну. Але на справе яны зараз зусім адарваны ад вытворчасьці. З праверкі 9-ці таварышоў выявілася, што ніводзін рабфакавец - комсамолец ня ведае аб ходзе выкананьня прамфінпляноў на прадпрыемствах, ніводзін з іх ня мае сувязі з вытворчасьцю.

Нядарма ў час чысткі аднэй комсамолкі - рабфакаўкі тут-жа на сходзе выступае работніца з вагонных майстэрняў і заяўляе, што гэтая комсамолка зусім ня цікавіцца вытворчасьцю, не наведвае рабочых сходаў і г. д.

Пасьля гэтага абгрунтавана правільнага выступленьня работніцы рабфакаўцы яшчэ адважаюцца выступаць у абарону правяраемай: „Вы самі вінаваты, што да вас ня ходзяць", не абгрунтоўваючы сваіх слоў конкрэтнымі фактамі.

Гэтае бязглуздае выступленьне яскрава гаворыць нам аб тым, што некаторыя комсамольцы-рабфакаўцы яшчэ дагэтуль не разумеюць політычнай важнасьці сувязі з вытворчасьцю.

Трэба зазначыць, што некаторыя комсамольцы-рабфакаўцы ня добра ўразумелі лёзунгу самакрытыкі і практычнага яго праламленьня ўва ўсёй рабфакаўскай рабоце і па-за ёю.

Калі ў час чысткі, аднаму правяраемаму комсамольцу задаюць пытаньне, як ён практычна прымяняе лёзунг партыі аб самакрытыцы ў жыцьцё, дык ён адказвае: — **Я ў водпуску ня быў, а пагэтаму мне недзе было прымяняць лёзунг самакрытыкі** (!?).

Гэты адказ паказвае нам наколькі некаторыя комсамольцы не ўразумелі лёзунгу самакрытыкі, наколькі яны не разумеюць, што самакрытыка зьяўляецца лепшым мэтадам палепшаньня акадэмічнай пасьпяховасьці, грамадзкай работы і наогул выпраўленьня ўсіх хібаў, якія маюцца ў рабоце самога рабфаку.

У зьвязку з неразуменьнем лёзунгу разгортваньня самакрытыкі, на рабфаку заўважваецца заціск яе з боку саміх-жа студэнтаў і нават комсамольцаў.

Калі на сходзе выступіла комсамолка па разбору кандыдатуры тав. Адзінца,—самага аполітычнага рабфакаўца-комсамольца, адарванага ад грамадзкай работы, і зазначыла цэлы шэраг хібаў у яго рабоце, дык пасьля гэтага выступленьня студэнты напалі на яе злаянкай за тое, што яна „пасьмела" крытыкнуць Адзінца. Бязумоўна, што ў такіх умовах, пры такіх адносінах нельга будзе выявіць клясавы твар таго ці іншага комсамольца.

Заўважваецца, што выступленьні рабфакаўцаў-комсамольцаў на чыстцы маюць пераважна ўзаемна асабісты характар,—як правяраемыя адносяцца да студэнтаў, студэнтак, адносіны да вучобы і г. д. Але зусім змазваецца тая політычная ўстаноўка, што чыстка павінна праходзіць з пункту погляду вывучэньня політычна-клясавага твару кожнага комсамольца і праверкі чоткасьці клясавай лініі ў рабоце рабфакаўскай ячэйкі. Вось гэтую ўстаноўку прыходзіцца даваць правяркому пасьля кожнага выступленьня.

Цяпер, калі прыглядзецца да політычнай падрыхтаванасьці комсамольцаў, дык трэба адзначыць, што ня ўсе дастаткова падрыхтаваны. Частка комсамольцаў-рабфакаўцаў вельмі вузка разумее некаторыя політычныя пытаньні, як напрыклад: артыкул тав. Сталіна, пытаньні нацдэмократызму і г. д.

Некаторыя комсамольцы зусім адарваны ад грамадзкага жыцьця рабфаку; гэта часткова тлумачыцца і сямейнымі абставінамі. Наглядаюцца праявы індывідуалізму з боку некаторых комсамольцаў-рабфакаўцаў да сваіх-жа таварышоў. Замест таго, каб больш пасьпяваючыя акадэмічна дапамагалі адстаючым, яны ідуць на мяшчанскія, абывацельскія вячоркі, і зусім не зацікаўлены ў тым, каб дапамагчы свайму таварышу ў рабоце.

Чыстка рабфакаўцаў можа даць належныя вынікі толькі тады, калі будзе забясьпечана шырокая актыўнасьць ўсіх комсамольцаў і беспартыйнай моладзі, калі адзіным мэтадам па выяўленьню хібаў і клясавага твару таго ці іншага комсамольца будзе зьяўляцца разгорнутая бальшавіцкая сама крытыка.

Сёмка.

Некаторыя студэнты-рабфакаўцы зусім адарваліся ад вытворчасьці



Я-ж вучуся, якая мне справа да прамфінпляну(!?)

Так... адзін за адным праходзяць чыстку Мэдфакаўцы

Першы вечар чысткі комсамольцаў-выпускнікаў Мэдфаку прыцягнуў да сябе ўвагу досыць многіх студэнтаў. Насьценгазэта выпусьціла спэцыяльны дадатак „Мэдфакаўца", прысьвечаны чыстцы комсамолу. Зьмешчаныя артыкулы завастрылі ўвагу студэнцтва, узьнялі іх актыўнасьць, чаго, на вялікі жаль, ня робяць іншыя насьценгазэты факультэтаў БДУ.

Хаця аўдыторыя была і перапоўнена, але наведваньне прымушае чакаць лепшага. Ня было ніводнага навуковага працаўніка, ніводнага чырвонаармейца, хаця апошнія і добра былі паведамлены. Прысутнасьць студэнцтва ўсяго пятага курсу, комсамольцы якога падлягаюць чыстцы, была-б вельмі пажадана, але ў сапраўднасьці зьявілася толькі 40% курсу. На сходзе прысутнічалі рабочыя падшэфнага заводу „Энэргія".

Частка комсамольцаў ня выконвае ўсіх пунктаў соцспаборніцтва, часамі паказвае дрэнны прыклад. Частка комсамольцаў і беспартыйнага студэнцтва казённа адносяцца да беларусізацыі, ня ўжываюць беларускае мовы ў штодзённым жыцьці. Работа па сувязі з вытворчасьцю на курсе кульгае. Некаторыя комсамольцы зусім страцілі свой комсамольскі твар, не карыстаюцца аўторытэтам сярод беспартыйнай масы студэнцтва.

Былі нездаровыя настроі пры выключэньні чужога элементу: Будая, Лапюка. Некаторыя комсамольцы нават спачувалі гэтым чужакам, а комсамольская група курсу не дала належнага адпору.

Трэба адзначыць, што ў спрэчках зусім ня бралі ўдзелу рабочыя, якія прысутнічалі на чыстцы. Вельмі слаба ўцягнута ў спрэчкі і беспартыйнае студэнцтва. Партыйцаў на сходзе было вельмі мала.

Першым чыстку праходзіць Агейчанка--комсамолец з 1923 г., быў актыўным студэнтам, рэдактарам газэты **„Быт інтэрнату"**, працаваў па піонэрскай лініі, шмат працуе над сабою, над пашырэньнем свайго дыялектыўнага і матэрыялістычнага сьветапогляду. Аднак нядаўна гэты-ж самы Агейчанка прыходзіць у праўленьне ўнівэрсытэту, дастае нейкім чынам сваю асабовую справу і самавольна, бяз ведама організацыі, выпраўляе маемаснае становішча сваіх бацькоў,—з 8 дзесяцін на 15, бо за апошні час пачалі пагаварваць, што Агейчанка захоўвае сваё соцыяльнае становішча. Пачуўшы такія гутаркі, ён рашыў выправіць сваю „памылку". На пасяджэньні бюро ён катэгарычна адмовіўся ад гэтага, але пасьля прызнаў сваю памылку. Студэнцтва асудзіла ўчынак Агейчыка, як захаваньне свайго соцстановішча, але знайшліся і такія, якія абаранялі Агейчанку, кажучы, што ён—сьвядомы, актыўны комсамолец. Агейчанка, робячы даклад на практычных занятках па дыялектыцы, адмовіўся гаварыць на беларускай мове. Калі старшыня камісіі тав. Харкоў запытаў яго, чаму ён адмовіўся ад правядзеньня дакладу па-беларуску, Агейчык адказвае: — **„Бачыце, я гавару па расійску, каб даклад правесьці ў больш «зразумелай» форме**, а беларуская мова, разумеецца, мова „незразумелая".

У дакладной запісцы бюро колектыву Агейчанка заўважвае: **„Прошу извинения, что пишу на русском языке, ибо пишу под диктовку чувств"**. Камісія папэўна ўлічыць гэтыя ўсе факты.

Наступнай праходзіць чыстку комсамолка т. Апарцава. Актыўная, вытрыманая, раней працавала афіцыянткай у сталоўцы, цяпер ужо зьяўляецца студэнткай 5 курсу. Хутка—наш чырвоны спэцыялісты, савецкі ўрач, шчырая грамадзкая працаўніца. Так адзін за адным праходзяць комсамольцы-выпускнікі ВНУ чыстку КСМ.

Прысутны.

На ўсебеларускай нарадзе рэдактароў фабрычна-заводзкіх газэт

Друк павінен быць моцнай зброяй барацьбы супроць ухілаў ад ленінскай лініі партыі

Уся работа фабрычна-заводзкай газэты павінна быць праніззана ўпартай барацьбой за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляпаў

(З дакладу тав. Курціка)

Шматтыражка, друкаваная фабрычна-завадзкая газэта—гэта ўзброенае поліграфічнай тэхнікай дзіцянё рэканструкцыйнага пэрыяду.

Самы факт зьяўленьня друкаваных фабрычна-заводзкіх газэт—зьявішча не выпадковае. Густая сетка друкаваных фабрычных газэт узрасла за апошнія год-два і ўзрасла на бальшавіцкіх дражджах, на дражджах актыўнасьці рабочае масы, самага шырокага разгорваньня самакрытыкі і гэраічнай барацьбы за сацыялістычнае будаўніцтва.

Па Сав цкаму Саюзу ўжо маецца тысяча фабрычных друкаваных газэт з тыражом у 2 мільёны экзэмпляраў. Насьценных газэт налічваецца сто тысяч у той час, як у 1926 годзе іх налічвалася ўсяго 36 тысяч. Характэрна адзначыць дынаміку росту колькасьці фабрычных друкаваных газэт:—крывая ўвесь час ідзе ўверх, шматтыражкі ўзьніклі, галоўным чынам, за апошні год, за апошнія месяцы апошняга году. Шматтыражкі (друкаваныя фабрычныя газэты), не закрэсьліваючы фактам свайго існаваньня шматлікія насьценныя газэты, разам з тым занялі плотна і ёмка сваё месца на заводзе, у цэху. Шматтыражкі ўрасьлі ў плоць і кроў прадпрыемства, іх ад нутра прадпрыемства не адарвеш.

Ленін у часы глыбокага падпольля пісаў:

„Трэба дамагчыся, каб рабочыя непасрэдна пісалі ў газэту. Бяз гэтага газэта ня будзе рабочай. Нам важна мець таксама рабочых карэспандэнтаў, а іх мала, трэба каб дзесяткі і сотні рабочых проста непасрэдна пісалі ў газэту". („З ліста да таварыша").

Праглядаючы камплекты фабрычна-заводзкіх друкаваных газэт, якіх у нас на Беларусі выдаецца звыш 40, ёсьць усе падставы, каб бяз ружовых акуляраў, без „похлопывания по плечу", зрабіць вынік аб тэй буйнейшай ролі, якую адыгрываюць шматтыражкі—гэтыя фабрычныя „полпреды" партыйна-савецкага друку.

Але на фоне гэтых шматлікіх станоўчых, дадатных бакоў, якія гавораць аб вялізарнейшай ролі фабрычна-заводзкіх газэт у барацьбе за прамфінплян, нам зараз патрэбна паказаць недахопы газэты, карэньні гэтых недахопаў з тым, каб ня толькі фіксаваць факт, памылкі, але, канстатуючы іх, упор рабіць на іх выпраўленьні, на падвышэньні якасных паказчыкаў „продукцыі" нашых шматтыражак.

Фабрычна-заводзкія друкаваныя і насьценныя газэты позна павярнуліся „тварам да прамфінпляну", між тым амаль год таму назад у пастанове ЦК УсеКП(б) за 9 мая 1929 г. чотка і ясна даў заданьне ўсім нашым газэтам, за якое яны ўзяліся са значным спазьненьнем. Зараз трэба з асаблівай настойлівасьцю нагнаць упушчанае.

Барацьба за прамфінплян вызначае твар газэты

Мы патрабуем ад газэты барацьбы за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, па ўсім правілам гаспадарча-палітычнай „тактыкі і стратэгіі".

Шматтыражкі часта скальзяць па паверхнасьці пытаньняў, ня ўмеючы выбіраць і ставіць асноўныя, вядучыя, зьвеньнявыя пытаньні.

Віцебская газэта „Мэтпромавец" у сваёй справаздачы досыць самакрытычна піша: „Прамфінплян ня быў даведзены ў цэх, да кожнага рабочага ў паасобку, а газэта „Мэтпромавец", вядучы барацьбу за выкананьне прамфінпляну, нічога не зрабіла для таго, каб дапамагчы рабочай масе разабрацца ў прамфінпляне заводу".

Сказана самой рэдакцыяй досыць чотка, ясна і... сумна.

Адна з лепшых у Беларусі шматтыражак—газэта „Трускі" надрукавала кантрольныя лічбы на 1929-30 г., але гэтыя лічбы прыпадиесла так, што атрымаўся ня ўдарны, зажыгаючы, арганізуючы артыкул, а нейкія дзьве працяжныя „калбасы"—каленкі.

На вышэйшую ступень

Наш друк павінен перайсьці на больш высокую ступень штодзённай барацьбы за прамфінплян. Нам трэба браць упор на перавыкананьне прамфінпляну, на перакрыцьцё рознага роду аб'ектыўных фактараў і „вузкіх месц" (на якія ў нас так многа любяць спасылацца), на вышуканьне ўнутраных рэсурсаў прадпрыемства з тым, каб забясьпечыць выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады. Між тым, „у сям'і не бяз урода"—ёсьць асобныя шматтыражкі, якія ня толькі ня выконваюць сваёй ролі ў барацьбе за прамфінплян, але фактычна ставяць палкі ў калёсы. Шматтыражка „Чырвонае шыла" (фабрыка „Труд") у артыкуле аб становішчы фабрыкі піша, прыблізна, наступнае:

„Хто вінават у становішчы на фабрыцы? Вінаваты ўсе, за выключэньнем рабочых".

Такая пастаноўка пытаньня, замест барацьбы і мобілізацыі сіл грамадзкасьці ўсяго прадпрыемства для барацьбы, толькі дэмаралізуе. Тая-ж газэта „Чырвонае Шыла" дае надзвычайна яскравы ўзор хвасьцізму, ад сталых настрояў, калі яна невыкананьне прамфінпляну тлумачыць тым, што, бачыце, вінавата адміністрацыя і... рэконструкцыі фабрыкі! Гэта ўжо значыць, што аб'ектыўна газэта выкарыстоўваецца для клясава-варожых нам мэтаў. Калі да гэтага дадаць, што тая-ж самая газэта „Чырвонае Шыла" піша, што „аб перавыкананьні прамфінпляну зараз і гутаркі ня можа быць", дык у нас ёсьць усе падставы казаць аб палітычным банкруцтве сучаснай рэдкалегіі.

Концэнтраваць увагу на галоўным

Шэраг пытаньняў, якія складаюць нутро, сэрцавіну барацьбы за прам фінплян, мы часта ўпускаем. У фабрычных шматтыражках няма паказу ролі вытворчых нарад, як актыўнай сілы, якая непасрэдна робіць уплыў на выкананьне прамфінпляну, на праверку таго, ці няма „очковтирательства", пераўмяншэньня прамфінпляну. Замацаваньне соцыялістычнага спаборніцтва ў значнай меры залежыць ад вырашэньня пытаньня аб кіраўніцтве ўдарнікамі ня толькі з пункту погляду скліканьня канфэрэнцый ударнікаў (гэта справа добрая), ня толькі з пункту погляду „барабанных" рэзолюцый, але з пункту погляду організацыі працы на вытворчасьці, як цэнтральнага, рашаючага пытаньня дзелавой эфэктыўнасьці соцыялістычнага спаборніцтва, якое павінна зьявіцца штодзённым мэтадам работы прадпрыемстваў.

Чырвоныя і чорныя дошкі зьяўляюцца надзвычайна моцнай зброяй нашага газэтнага арсэналу, але карыстаемся мы гэтым сродкам мобілізацыі актыўнасьці мас надзвычайна дрэнна. Мы ня можам паскардзіцца на тое, што ў шматтыражках мала чорных дошак. Наадварот, амаль у кожным нумары, па кожнаму поваду можна сустрэць чырвоную і чорную дошку: выпіў—на чорную дошку, прагуляў—на чорную дошку, унёс у фонд індустрыялізацыі некалькі рублёў—на чырвоную дошку; і г.д. Такі лёгкаважны падыход значна зьніжае выхаваўчае значэньне гэтых „дошак", якія, зразумела, зьяўляюцца не самамэтай, а сродкам для стымуліраваньня барацьбы за прамфінплян. Газэтам патрэбна гэтакім чынам перабудаваць сваю работу, ye гнуткасьць, каб ня толькі „пасадзіць" на чорную дошку але і дапамагаць прадпрыемству сьцерці сваю назву з ганебнай чорнай дошкі.


Барацьба за падвышэньне якасьных паказчыкаў выпускаемай прадукцыі, за ператварэньне сацыялістычнага спаборніцтва ў штодзённы мэтад работы прадпрыемстваў, фактычнае ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі аб правядзеньні адзінаначальля, падвышэньне рэальнай заработнай платы, давядзеньне прамфінпляну да кожнага рабочага, пераключэньне энтузіязму рабочых мас на навуковую організацыю вытворчасьці, практычнае вырашэньне пытаньня аб організацыі працы ўдарнікаў, самае шырокае разгортваньне самакрытыкі, выкрываньне і бязьлітасная барацьба з праявамі правай практыкі, з праявамі „левых" загібаў,—вось, прыблізна, асноўнае, на чым у першую чаргу павінна канцэнтравацца ўвага фабрычна-заводзкіх друкаваных газэт для забесьпячэньня выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну, увязваючы гэтыя пытаньні ў адзін сьціплы жгут—жгут барацьбы за прамфінплян.

(Канец заўтра).

З фото-апаратам па Менску

Будаўніцтва сельска-гаспадарчай выстаўкі

НА ЗДЫМКУ: зьверху ўніз: галоўныя вароты, вегэтацыйны павільён і павільён кустарных вырабаў.



Слухайце... слухайце...

20 красавіка ў радыё-концэрце па заказу слухачоў, а таксама 21 у пасьля-абедзеным концэрце (а 17 гадзіне) выступіць солісты-віртуоз т. Гурылёў.

Гітара—інструмант, які лічыўся да гэтага часу ў нас прадметам мяшчанскага ўжытку. З моманту свайго паяўленьня (у Гішпаніі ў 18 стагодзьдзі) гітара служыла акомпаніруючым інструмантам для розных любоўных сэрэнад і „пачуцьцёвых" романсаў. Зараз яна ўсё больш пачынае прыцягваць да сябе ўвагу музыкаў, як выканаўцаў, так і композытараў, і ўвагу шырокіх колаў працоўных. Апошнія дасягненьні ў гэтай галіне даводзяць, што на гітары можна ня толькі акампаніраваць, але і выконваць складаныя рэчы розных композытараў (Моцарт, Бэтговэн, Шопэн, Грыг і інш.). Нажаль, трэба сказаць, што гітара, як сольны інструмант, у рабочых клюбах, а таксама на концэртных эстрадах мала распаўсюджана. Надзвычайна тонкае, мастацкае выкананьне, вялікая тэхніка ўладаньня такім складаным інструмантам, як двухгрыфная гітара, добраякасны рэпэртуар артыстага Гурылёва,—усё гэта гаворыць за тое, што нашы рабочыя радыё-слухачы і комсамолія з напружанай увагай пасядуць у гэты час каля гучна-гаварыцеляў і навушнікаў.

І. Любан

Гомель—Кіеў—Днепрабуд

Сож—Днепр—Дняпроўскія парогі

Усебеларуская экскурсія комсамольцаў і працоўнай моладзі Беларусі на Украіну адбудзецца ў маі месяцы.

Тэрмін экскурсіі—два тыдні, пачынаючы з 15 мая.

Кошт экскурсіі—46 рублёў (поўнае абслугоўваньне).

Канчатковы тэрмін падачы заяў—да 25 красавіка.

Грошы ўносяцца: Першы ўзнос—23 руб. адначас[ова з] заявою—да 25 красавіка, другі ўзнос—23 рублі—да 5 [мая].

Заявы і грошы на экскурсію дасылайце ў адрас: Менск, Комсамольская, 25, экскурсійнай камісіі газэты [„Чыр]вонай Зьмена".

Па ўсіх пытаньнях аб экскурсіі званеце па тэлефону

Бася Баброва



11-га красавіка ад брушнога тыфусу ў Маскве памерла комсамолка—работніца Менскай абутковай фабрыкі—Баброва Бася.

Тав. Баброва радзілася ў сям'і рабочага кушнера. У комсамол уступіла ў 1925 годзе, кандыдат партыі з 1929 году.

Будучы вучаніцай профшколы абутнікаў, Баброва паказала сябе аднэй з самых актыўнейшых комсамолак,—увесь свой эн[тузіязм і] энэргію аддавала на ко[мсамоль]скую працу. Доўгі час я[на зьяў]лялася сэкратаром комса[мольскай] ячэйкі. Па сканчэньню пр[офшко]лы яна перашла на працу [на абут]ковую фабрыку і тут з н[ялюд]шай актыўнасьцю ўзялася [за ком]самольскую грамадзкую р[аботу,] была апоргам колектыву, [сябра]м бюро цэхавай ячэйкі [комса]молу.

Разам з гэтым тав. Баб[рова бы]ла рэдактарам маладзёжн[ай газэ]ты. Зьяўлялася актыўнай [юнкоркай] цэнтральнага органу [комсамо]лу Беларусі—„Чырвонай [Зьмены"].

У канцы 1929 году комс[амольскі] колектыў абутковай фабр[ыкі пасы]лаў тав. Баброву на [вучобу ў] Мэндэлееўскі інстытут, [дзе яна] сур'ёзна захварэла. 11-га [красаві]ка,—на 24 годзе жыцьця,—[Бабро]вай—аднэй з лепшых ком[самолак-]партыек, ня стала ў нашы[х шэра]гах.

Група тавар[ышоў]

Бюро комсамольскага колектыву Менскай абутковай фаб[рыкі] паведамляе аб раптоўнай сьмерці свайго лепшага тавар[ыша] актыўнай комсамолкі-партыйкі

Басі БАБРОВАЙ.

Рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена" выказвае глыбокі [жаль] з прычыны нечаканай сьмерці сваёй актыўнай юнкоркі

БАБРОВАЙ Басі.

Паведамленьні

ДОМ КОМАСЬВЕТЫ. 21-га красавіка, а 7-ай гадзіне ўвечары ў Доме Комасьветы адбудзецца даклад тав. Стракоўскага на тэму: „Вынікі выкананьня промфінпляну ў прамысловасьці БССР за першае паўгодзьдзе".—пасьля дакладу мастацкая частка. Білеты па райкомам КП(б)Б, ЛКСМБ і ў чытальні дому.

Усе мэдычныя працаўнікі: дактары, зубныя дактары, фэльчары, мэд. сёстры, санітаркі, акушоркі, фармацэўты, лекпомы і іншыя, якія састаяць на вучоце біржы працы павінны зьявіцца 29-га красавіка, а 10-ай гадзіне раніцы ў бюро пасылкі да перапісі мэдпрацаўнікоў.

Кастрычнікаўскі РК ЛКСМБ паведамляе апоргаў і масавых працаўнікоў ячэек аб тым, што 20-га красавіка ад 6 да 8 гадзін увечары адбудзецца консультацыя тав. Шамшура па пытаньнях масавай працы на летні час.

21-га красавіка, а 6-й увечары адбудзецца пас[яджэньне] Акруговай Прыймовай К[амісіі ў] памяшканьні АК ЛКСМБ.

Яўка сяброў камісіі аба[вязкова].

Заўтра 19-IV а 7-й гад[зіне ўве]чары ў памяшканьні АК [ЛКСМБ] адбудзецца нарада ўсіх у[паўнава]жаных „Комсамольской [...] ячэек гораду Менску.

Усе ўпаўнаважаныя па[д асаблі]вую адказнасьць сэкратар[оў ячэек] павінны зьявіцца на нар[аду без] спазьненьня. У гэты веча[р упаўна]важаныя „Комсамольско[й праў]ды" павінны быць вызва[лены ад] іншых абавязкаў.

Адказны рэдакт[ар]
Рэдколе[гія]

Менск, друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 5[...]